Дзяржаўная бібліятэка СССР

пролетары ўсіх краеў, злучайцеся!

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА



САКАВІК
№3
1928

А. ПРАЛІЧ—член ЦВК СССР, інструмэнтальшчыца Менскага дэпо чыгункі МББ.

С этим номером рассылается выкройка мужской нижней рубашки.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

Енш, Т. Ивановой—Статьи Ваши не пойдут в печать. Если бы в них были приведены примеры из местной жизни, можно было бы использовать и после праздника.

Е. Жыгалцы, Т. Трапашцы—Вашы заметкі аб сельсавеце і аб ваенным паходзе перасланы ў „Беларускую вёску“.

А. Рудиной.—Ваши воспоминания о Красной армии говорят красноречиво о том, как вы стали активной участницей революции, а не о том, что вы делали в рядах Красной армии. (Об этом у Вас пара строчек). Поэтому и не помещаем. Писать вы умеете и мы просим и в дальнейшем быть нашей активной рабкоркой.

П. Червинской.—Материал опоздал.

Прохожему.—Ваше заявление о старухе Славиковской было редакцией послано на расследование во 2 участок милиции г. Минска и выяснилось следующее: действительно старуха находится в плохих гигиенических условиях, сын и невестка действительно невнимательны к ней, но что они не избивают старуху.

Марусе Киселевой.—Автобиографию не печатаем. Пишите о работе делегаток на „Дубровенской мануфактуре“.

М. Хазану и *Крыльцовой.*—Библиотечки годовым и полугодовым подписчикам за 1927 год с некоторым опозданием, в начале марта, уже разосланы.

А. Новышу, Балоцінай, Куксінскай, Паўлоўскай, Мсьціслаўскай, Быхаўскай, Ліўшыц, Ландо.—Вашы матэрыялы да сьвята 8-га сакавіка ў нумар „Беларускай Работніцы і Сялянкі“, прысьвечаныя гэтаму сьвяту, спазьніліся. Каб не пакінуць іх ня выкарыстанымі, другога сакавіка рэдакцыя пераслала іх у рэдакцыю газэты „Зьвязда“.

М. Ермаковіч.—Вашу аўтабіаграфію перасылаем у „Чырвоную Зьмену“. Пішэце нам аб коопэраваньні сялянак, аб уцягваньні іх у грамадзкую працу, аб іх быце і г. д.

Н. Васілеўскай.—Вашы два пісьмы (ад 21 і 26 лютага) атрымалі. Вельмі добра, што наладзілася сувязь, цікава было-б атрымаць ад гуртка некалькі бягучых пратаколаў занятак (выслаць можна бяз маркі). Чакаем таксама допісаў ад членаў Вашага гуртка.

Е. Игнатович.—Напишите, как делегатки-польки провели 8 марта и как удалась постановка пьесы.

Лычкоўскай.—Заметку аб леташніх ясьлях друкаваць ня будзем. Напішэце, як сёлета рыхтуюцца сялянкі да гэтае кампаніі. Аб працы сябра сельсавета—жанчыны, таксама друкаваць ня будзем.

Г. Балатоўскай.—Вось Вы пішаце, што ўдзельнічаеце ў працы савету, коопэрацыі і інш., а што практычнага вы там робіце? Напішэце, калі ласка, якую працу даручае Вам сельсавет, коопэрацыя, і як Вы яе выконваеце. Адну заметку зьмяшчаем.

Марозавай.—Ня пойдзе. Чаму не напісалі, якой працай заваявала т. Андрэйчыкава аўтарытэт.

Дахич.—О Красном Кресте в Городокском районе уже печатали в прошлом номере.

Дрэйзінай.—Напішэце аб тым, якая палітасьветная праца праводзіцца ў гуртку кройкі і шыцьця.

С. Палятовіч.—Мысьлі адносна таго, што трэба рабіць дэлегаткам, справядлівыя, іх можаце выказаць гуртку таварышак, пагаманіць з імі аб гэтым. Для друку яны не гадзяцца, бо ўжо ня новыя і загэтым дзеля масавага чытача няцікавыя.

Н. Кривоносовой.—Пишите, как работают ваши делегатки, относительно врача—так может-быть у него было неотложное дело из-за которого он и не мог выехать. Если этого не было—надо сообщить в РИК. Заметку печатать не будем.

Наталцы.—Аб т. Гольдберг у нас ужо раз друкавалася.

Ф. Селево.—Пишите о том, как втягиваются батрачки в общественную жизнь, о их быте, запросах и т. д.

Т. Фаміцкай.—Пішэце, у чым больш выяўляецца сьвядомая актыўнасьць сялянак. Заметку друкуем.

О. Дзянісэвіч.—Вельмі добра будзе, калі вы сваім прыкладам пакажаце сялянкам, што і жанчына можа быць добрым грамадзкім працаўніком.

А. Гед.—(Вялешынская школа). Організуйце гурток прыхільнікаў нашай часопісі. Напішэце пра пазыку ўзмацненьня сельскай гаспадаркі, як яна пашыраецца сярод сялян і сялянак.

М. А.—(Бярэзінскі РК).—Веды аб падпісцы па раёну вы можаце атрымаць у Райпашт. адзяленьні.

П. Лабус.—Чакаем ад Вас новых пісем, сьвежых допісаў.

А. Соколовой, Н. Еремовой, Элькиной.—Помещаем Ваши фотографии и письма использовываем для подписей.

П. Мініну, А. Гладкаму.—Вершы „Плакала Горка“ і „Маці“—перасылаем у „Беларускую вёску“ для дадатку „Чырвоны сейбіт“. Да нашай часопісі не падышлі. Здольнасьць да пісаньня у абоіх адчуваецца, дык мы і накіроўваем Вас да часопісі, якая працу з пачынаючымі пісьменьнікамі вядзе больш шырока і стала.

Ясновидящей и Дривотиной.—Стихи к 8-му марта опоздали. К тому же их печатать все равно не можем: первый—тяжелый для наших читальниц, второй—необработанный.

В. Шэмпелю.—Ваш верш напісан досыць шчыра, з пачуцьцём, але слабы. Раім больш старанна вывучаць беларускую мову, бо яна ў вас дужа ня чыстая, і нават мясьцінамі недарэчнасьці; напрыклад: „да пары шалеюць ўсе паны-зладзеі, толькі сёстры млеюць, *ждуць ад нас надзеі*“. Сказ пабудован зусім няправільна. Больш працуйце над сваім агульным разьвіцьцём, бо верш настраёвы, але ня глыбокі. Аб жыцьці і працы работніц заводу, калі ласка, пішэце.

П. Зарніцкаму, Н. Аляксеевай. Вашы вершы таксама друкаваць ня будзем, слаба апрацаваны.

М. Івашкевічу.—Вы, таварыш, наіўнасьць грубую дапускаеце.

Апісваючы чорнымі фарбамі мінулае, вы ўпэўніваеце работніц і сялянак. „...Запраўды, так было, ...а мо і не паверыш?

Бо дзесяць год ужо прайшло,
Магла-ж запамятаваць ты“...

Раім больш крытычна і (галоўнае) больш уважна адносіцца да таго, што пішаце. Верш друкаваць ня будзем.

ВСЕСОЮЗ. ГОСБИБЛИОТЕКА Т.С.С.Р.
Инв. № 12

БЕЛАРУСКАЯ РАБОТНІЦА і СЯЛЯНКА

Адрас рэдакцыі:
Менск, Савецкая вул., № 45
Тэлефон № 419

ОРГАН АДДЗЕЛУ РАБОТНІЦ І СЯЛЯНАК
ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ
КОМУНІСТ. ПАРТЫІ (бальш.) БЕЛАРУСІ

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На 1 месяц . . . 15 кап.
„ 3 „ . . . . 45 „
„ 6 „ . . . . 90 „
На год „ . . . 1 р. 80 „

№ 3 (41) || Сакавік (март) 1928 г. || № 3 (41)

Пад пятой пана.

Польскія паны, рыхтуючыся да вайны, хочуць разьвязаць сабе рукі. Ім трэба зьнішчыць усё рэволюцыйнае, што ёсьць у Польшчы, ім трэба супакоіць, задушыць нездаволенасьць працоўных мас. Арыштамі і турмамі, зьдзекамі яны хочуць загасіць рэволюцыйны рух у Заходняй Беларусі.

У апошнім нумары нашай часопісі паведамлялася аб судзе над 133 рабочымі і сялянамі, якіх урад Пілсудзкага абвінавачвае ў прыналежнасьці да комуністычнай партыі.

Зараз-жа, 23 лютага, польскія паны пачалі судзіць Беларускую Грамаду—рэволюцыйную організацыю сялян і рабочых Заходняй Беларусі ў асобе 56 сяброў Грамады.

Суд над Грамадой—гэта суд над батракамі, беднякамі і сераднякамі Заходняй Беларусі.

За што паны судзяць Грамаду?

Яшчэ ў 1925 годзе сяляне Заходняй Беларусі пачынаюць змаганьне за зямлю з панскімі ўласьнікамі, з панскімі зьдзекамі. Сяляне Заходняй Беларусі пачынаюць разумець, што шлях іх вызваленьня,—гэта організацыя моцнага саюзу рабочых і сялян. Яны ствараюць рэволюцыйную організацыю Грамаду, якая ахапіла да 100 тысяч сялян і рабочых Беларусі. Грамаду, якая паставіла сваёй мэтай—змаганьне за рабоча-сялянскую ўладу, за нацыянальнае вызваленьне, барацьбу за вызваленьне працоўных мас Заходняй Беларусі з-пад улады памешчыкаў і капіталістых.

Грамада вяла барацьбу за існаваньне беларускіх школ, якія польская ўлада пазакрывала. Грамада змагалася за вызваленьне арыштаваных працоўных з турмаў. Грамада абараняла інтарэсы батракоў, змагалася за лепшыя ўмовы іх жыцьця.

Грамада стала цэнтрам рэволюцыйнай барацьбы ў беларускай вёсцы ў Польшчы.

Вось за што польскія паны парашылі зьнішчыць Грамаду. Вось чаму 100-тысячная організацыя была разгромлена і запратаны ў турмы лепшыя барацьбіты, вось чаму паны катавалі і катуюць сотні і тысячы рэволюцыйных сялян.

За тое, што сяляне Заходняй Беларусі пасьмелі падняць свой голас супроць польскіх зьдзекаў, што яны захацелі зямлі, за тое, што яны асьмеліліся патрабаваць у школах сваёй роднай мовы—польскія паны распраўляюцца з імі.

У беларускага працоўнага народу заўсёды застануцца ў памяці нячувалыя катаваньні над імі. Кроў стыне ў жылах, калі слухаеш і чытаеш аб гэтых катаваньнях.

Вось адзін з тысячы прыкладаў зьверства польскіх паноў. Селяніна Кандрата Панасенка, з вёскі Савіч у Слоніме, пасьля біцьця рэвальверам, падвесілі за моцна зьвязаныя назад рукі і білі па твары, разьдзявалі і валаклі па зямлі, ламалі пальцы, расчынялі жалезам рот і ўлівалі ваду. Гэта толькі маленькая частка таго, што польская ахранка зрабіла з Панасенкам.

Другі прыклад—паліцыянты Кобрынскага павету арыштаваных сялян білі кіямі ў пяты, вырывалі з галавы валасы і тапталі нагамі, плявалі сваім ахвярам у твар. Каб заглушыць крыкі, арыштаваным накідалі на галовы кажухі, затыкалі рот анучамі і прымушалі яшчэ іграць на бандуры і пяць.

Вось як жывецца працоўным ў Заходняй Беларусі.

Паны судзяць Грамаду, але-ж няхай яны ведаюць, што гэтым судом, сваімі зьдзекамі, яны ня спыняць рэволюцыйнай барацьбы, ня прытупяць волю і імкненьні працоўных да вызваленьня!

Меярзон.

Работница, поднимай свою квалификацию.

Промышленность у нас с каждым годом расширяется. Пускаются новые фабрики и заводы. Расширяются существующие предприятия, открываются новые цеха, вводятся вторые смены, устанавливаются механизированные станки, которые увеличивают производительность труда.

С расширением промышленности увеличивается и количество рабочей силы в производстве как мужской, так и женской.

В государственной промышленности Высшего Совета Народного Хозяйства Белоруссии на 1-е июля 1927 года было занято: 6.503 работницы, а на 1-е ноября этого же года—7.192 работницы. Наибольший рост женской рабочей силы дали химическая промышленность, бумажная и стекольная.

Трудколлективы в наших белорусских условиях занимают значительное место в промышленности и здесь количество занятых женщин с каждым днем увеличивается: на 1 I-27 года было занято 1.670 женщин, а на 1 VIII-27—уже 2.655.

Из этих цифр видно, что вовлечение работниц в производство двинулось вперед, но здесь есть еще много больных мест.

Женский труд до сего времени в большинстве своем использовывается на подсобных неквалифицированных работах: в деревообрабатывающей промышленности неквалифицированных и малоквалифицированных работниц на каждую сотню работающих приходится больше 68, на железной дороге—больше 74, у бумажников—66, у кожевников—больше 79.

Партия и профсоюзы принимают меры к поднятию квалификации работниц. В 1926 году переведено на более квалифицированные работы 229 работниц. В 1927 году на дрожжевом заводе „Красная Заря“ (г. Минск) были поставлены две работницы на квалифицированную работу, но одна из них ушла с работы, не желая квалифицироваться, а вторая заболела независимо от работы в данном цеху; сейчас парт'ячейка и завком опять поставили вопрос о продвижении работниц на квалифицированные работы. В Гомеле, на стекольном заводе „Пролетарий“, две работницы готовятся стать выдувальщицами.



Тов. Шифрина у станка.

Посланы на металлообрабатывающий завод „Энергия“ (г. Минск) две девушки в качестве слесарей и на завод „Металл“—три. На обувной фабрике 10 работниц переведено к станкам. На бумажной фабрике в Добруше несколько человек готовятся к квалифицированной работе у рольных станков.

В „Полеспечати“ (Гомель) на бумажной фабрике „Спартак“ ряд работниц переведены в высшие разряды.

К сожалению, часто выявляется, что многие работницы сами не хотят квалифицироваться, предпочитая работать на подсобных работах: „пусть меньше заработаю, но зато работа легкая и чистая“,—вот что от многих мы слышали.

Работницы должны помнить, что для нашей социалистической промышленности нужна и более ценна квалифицированная рабочая сила, которая создает определенные ценности для нашей страны.

Работницы также должны знать, что, поднимая свою квалификацию, они этим самым улучшают свое материальное положение—чем квалифицированнее работница, тем она больше зарабатывает.

Каждая работница должна настойчиво добиваться повышения своей квалификации.

Тов. Русанович за работой.

Работницы, выдвигайте сами вопросы о своей квалификации перед партийной ячейкой и перед фабзавместкомом!

Не стесняйтесь, что первое время может быть вы встретитесь с ненормальными условиями в работе, как это было на обувной фабрике и на заводе „Металл". Ставьте тогда парт'ячейку и завком в известность и они вам помогут. Все препятствия, какие будут встречаться, надо побороть. Вот такими работницами, как Русанович с обувной фабрики, Шифрина з завода „Металл", мы можем гордиться. Поставили они своей целью добиться определенной квалификации и добились этого, несмотря на все препятствия, которые стояли на их пути. Побольше бы нам таких работниц, тогда дело с квалификацией работниц на производстве двинулось бы быстрее!

Квалифицированную рабочую силу мы подготовляем через бронь, ФЗУ, профтехшколы и курсы ЦИТ'а (Центрального Института Труда.) Задача этих курсов—дать квалификацию безработным рабочим, работницам.

Надо сказать, что безработных женщин на этих курсах мало. Об этих курсах должны знать работницы, они должны больше поступать на эти курсы. Надо помнить, что до тех пор, пока безработные женщины без квалификации,—трудно получить работу.

Больше настойчивости, больше энергии самих работниц в повышении своей квалификации. Социалистической промышленности нужны квалифицированные работницы.

Н. Танаевцева.

Трудколлектив чулочниц им. 1-го Мая.

В 1927 году к 8-му марта был решен вопрос об организации трудколлектива чулочниц для безработных женщин. Энергично взялись за дело. В мае была начата работа с подготовки работниц чулочному делу, так как на Бирже Труда совершенно отсутствовали вязальницы на круглых машинах.

Трудности в работе мы преодолели и имеем ко дню 8-го марта обученных 225 человек работниц. Ко дню 8-го марта фабрика подготовила к выпуску последующие цехи: красильню, отдельный цех, выпускающие готовую продукцию. До сих пор окраска и отделка производились на Витебской Государствен. фабрике.

Некоторые процессы производства механизированы. Фабрика приобрела крутильный ватер на 200 веретен, имеется 110 круглых вязальных машин, пять мотальных, несколько фланговых, скоро получим 20 круглых и 1 мотальную машину.

Растет и производительность труда. Вырабатываем в день 150 дюжин дамских чулок. Заработная плата также повысилась.

Из всего количества работниц 35 проц. составляет молодежь, остальная масса работницы-женщины, состоящие раньше на Бирже Труда, не имевшие никакой специальности.

При фабрике организована парт'ячейка, комсомол, который вырос с 14 человек до 39 членов. У нас есть и кружок красных сестер, выпуск которого состоялся 26-II в подшефной части Красной армии. Выписываются газеты и журналы, в том числе и журнал „Беларуская работніца і сялянка".

8-го марта состоялось торжественное открытие нашей фабрики. К этому времени приурочили выпуск брони.

В связи с открытием новых цехов, наша фабрика увеличивается за счет безработных женщин до 350 человек.

г. Витебск. Работница т/кол. **Зигельман.**



Чулочницы. Мотальное отделение.



Рассказ **М. Берегового.** *Рис. худ.* **Вало.**

Токарь по металлу

На улице было темно. Фонари разливали жирные круги света, вспыхивали и мигали. Падал снег.

Катя приподняла воротник и ускорила шаги. На заводском дворе жизнь уже кипела. Десятки рабочих, погружаясь в черные провалы корпусов, нарушали утреннюю тишину шутками и смехом.

— Почетному и потомственному пролетарию, привет...

— Вали скорей Катюха, а не то завод станет...

В этот день рабочие особенно горячо жали Кате руки. И неудивительно: недавняшняя подручная Катенька, сегодня—токарь по металлу, Екатерина Марковна Островская. Превращение воистину сказочное.

Пробило семь. Дрогнуло „Динамо". Запели машины.

Катя робко стала у ярко начищенного станка. Руки ее с любовью коснулись холодной стали, „наконец-то токарь по металлу". Вырвался, помимо ее воли, торжественный возглас.

Когда подошел мастер, Катя бойко передвигала штатипованную полосу. Волосы ее разметались, а косынка сползла на шею.

— Ишь, как заработалась, аж в пот вдарило!

— Кто дело делает, а кто под ногами путается,— огрызнулась Катя.

На обед Катя вышла последней. Руки горели от непривычной работы, но глаза лучились сознанием исполненного долга.

В столовой бодрость покинула Катю. Ложка застревала во рту, каждая улыбка, смех и шутка истолковывались ею, как насмешка и вызов. Казалось все смотрели на нее с укоризной... „Выскочка". „Тоже токарь".

Гудок прервал ее размышления. Столовка быстро пустела, а через минуту-другую обычный фабричный гул наполнил кварталы пригорода.

Снова стучал станок и руки Кати проворно бегали по рычажкам.

Свет и тени

Федька Родов—комсомолец. Но... кроме этого, Федька буян и бузотер. Федька Катю не взлюбил

— Тоже, паиньку корчит, газеты читает... подумаешь! Видали таких,—говорил он рабочим.

—Ну, это ты напрасно. Хоть и баба, а дело знает, а что твои шутки ей не по вкусу, так это она права. Ломаешься ты Федька, а любой „бронь" тебя за пояс заткнет, встречая такие ответы Федька темнел лицом и, скверно выругавшись, отходил.

Раз после перерыва Катя увидела над своим станком большой плакат. На плакате кривыми буквами было намалевано: „*лахудра ты, а не токарь*".

Слова лишнего не сказав, сорвала Катя бумагу, пододвинула гайку, нажала рычаг и со слезами на глазах продолжала работать.

Федька этого не ожидал. К директору не побежала, истерику не закатила, скандала не подняла... Это было выше его понимания.

После гудка, у ворот завода, догнал Федька Катю.

— Катя, а Катя!

Катя обернулась и, увидя Федьку, остановилась.

— Знаешь, Катюха, ведь это я плакат писал...

— Ты!

— Только я больше так писать не буду. Ты не такая, как все... Особенная ты, Катюха, баба.

Выпалив все и не ожидая ответа, Федька быстро повернул за угол и скрылся в толпе расходящихся по домам рабочих.

Катя осталась стоять, как вкопанная. Так вот, он какой парень, а я думала, хулиган неисправимый.

Уже подходя к дому, Катя столкнулась с мужем. Лицо его было бледно. Чуть пошатываясь, он входил в дом общежития.

— Митя, милый что с тобой?

Ничего не отвечая, он протянул ей маленькую бумажку—„на прочитай". Катя быстро схватила листок и вскрикнула:

...Дано сие Дмитрию Островскому, в том, что он... сокращается...

Сгущались сумерки.

Получка

День получки—праздничный день на заводе. Выстаивая в очереди у окошечка кассы, Катя думала о многом. Муж безработный, ее получки вряд ли хватит на две недели, впереди—голод.

— Островская, получите!..

Катя протянула руку, что это: один, другой, третий, четвертый... червонец.

— Товарищ кассир, вы ошиблись.

— Проверьте...

В ведомости черным по белому: Екатерина Островская, токарь по металлу—82 руб. 36 коп.

Катя засмеялась. Какая же я дура. Ведь я больше не подручная, *а токарь по металлу*. Ясное дело—денег больше.

— Не задерживай очереди, проходи—волновались рабочие.

Когда Катя ввалилась домой, с кучей свертков и мешечков, Дмитрий ахнул...

— Что ты, Катюха, рехнулась, что-ли? Я безработный, а ты деньгами соришь. Стыдно!

Катя, улыбаясь, рассказала ему случай у кассы.

Мандат № 134

Заводской клуб битком набит. Прения по наказу Горсовету давно закончены. Председатель позвонил.

— Товарищи, приступим к выборам депутатов в Горсовет. Есть предложения.

— Горохова Федьку... Андронича... Бегунца... Островскую...

Зал дрогнул. Островскую, Островскую даешь... Бегунца, Островскую! Опять позвонил колокольчик.

— Итак, товарищи, проголосуем. Кто за Островскую?

Лес рук. Особенно горячился Федька Родов—считать нечего. Все за нее. Она баба с характером. Бой-баба.

* * *

Секретарь ячейки, т. Фомин, читал заявление.

„...Хочу стать в ряды борцов партии Ленина, так как совестно стоять у станка и хлопать ушами, когда мои лучшие друзья отдают последние силы за наше общее дело...

Катя Островская. Токарь.

Говорить было не о чем. Прихода Кати в коммунистическую семью ждали давно. Поперек заявления легла четкая надпись—*принять*...

. . . . . .

В мандатной комиссии Горсовета сутулый деловод жирными буквами вписывал в еще пахнувший красный билет.

„...Дан Екатерине Марковне Островской за № 134...“.

В углу билета чернела карточка, из карточки смотрело на меня честное и открытое лицо токаря по металлу—Кати.

В. Скародзька.



...Я безработный, а ты деньгами соришь...

Заходняй Беларусі.

Каля дарогі плача асіна,
З ветрам аплаквае ўзятага сына,
Сумам тугою агорнуты стрэхі,
Дзесь зацягнула агідная ціна
Іскры уцехі.

Сын Беларусі за грознай сьцяною,
У ланцугох ён за кратай стальною.
Круціцца хмара паноў-груганоў...
І толькі разносіцца сьлёзнай жальбою
Звон кайданоў.

Радасьць забіта турмою-грамадаю,
Груганы круцяцца з грознай пагардаю.
Чорным арлом павісае закон,
І зачынілісь крываваю здрадаю
Радасьці звон.

Туліцца ночка вопраткай чорнаю,
Сын—беларус з галавой непакорнаю
Не паддаецца ні сьлёзам, ні суму—
У цёмную ночку, ў ночку бяззорную,
Думае думу.

Заўтра пакіне сьцежкі жыцьцёвыя
За свае думкі, вольныя, новыя;
Толькі ўцеха ў сэрцы адна:
Зьнікне няволя, згінуць аковы,
Будзе вясна.

Золата-рунь у палёх ня рунее,
Лежачы плуг, барана іржавее.
Не зааараны пустуе абшар.
Вецер асіну весткай абвеяў:
— „Зьнік гаспадар“.

Прыдуць часы, навальніца разьвернецца,
Чэрнь груганоў ўжо ніколі ня вернецца.
Помсты чакае магіла забытая.
Панскай крыві, няўзышоўшае зерне,
Просіць прыбітае.

Задачы сялянкі ў сёлетнюю пасяўную кампанію.

Пасяўная кампанія ў гэтым годзе мае асаблівую важнасьць. Мы перасягнулі даваенны ўзровень у нашай сельскай гаспадарцы, і цяпер перад усім бядняцка-серадняцкім сялянствам стаіць вялікая задача пановаму перабудаваць нашу сельскую гаспадарку. Пад гэтым трэба разумець такія задачы, каб, напрыклад, збожжавыя культуры—жыта, авёс, ячмень—давалі з дзесяціны *ня 40 пуд., а 100 пуд.*, каб бульба радзіла з дзесяціны *не 500 пудоў, а 1.000 пуд.*, каб карова давала ў год *не 56 вёдзер* малака, а ня менш *100* і г. д.

Што дзеля гэтага сялянка павінна рабіць у сёлетнюю сельска-гаспадарчую кампанію?

За колектывізацыю сельскай гаспадаркі.

Першае—пры дробным землякарыстаньні надзвычайна цяжка палепшыць сельскую гаспадарку, пагэтаму сёлета неабходна будзе перад сялянкамі паставіць задачу аб *калектывізацыі сельскай гаспадаркі.* Калектыўныя гаспадаркі, якія да гэтага часу існуюць, паказалі, што тыя беднякі, якія даўно аб'ядналіся ў колхозы лепш жывуць, чымся беднякі, якія засталіся весьці паасобную гаспадарку. Цэлы шэраг з іх ня мае часам каня, плуга, насеньня і іншага, а калі і здабывае бядняк інвэнтар, дык яму трудна ўтрымаць яго пры малазямельлі, пагэтаму выхадам да лепшага жыцьця павінна зьявіцца пераход да калхозу. Перад сялянкай такая задача стаіць *як аснаўная.*

Ачышчайце насеньне.

Другое—паставіць у гаспадарцы задачу ачысьціць к яравому севу ўвесь насенны матар'ял. Дзеля гэтага на пракатных пунктах, саўхозах, калхозах і каапэрацыйных таварыствах ёсьць належныя машыны, прылады. Сялянка павінна ведаць, што лепш засеяць менш добрага насеньня, чымся засеяць шмат, але-ж пустога, якое ніякага ўраджаю ня дасьць. Калі селянін і сее неачышчанае, пустое насеньне, ён абманвае сябе і сям'ю на цэлы год і падводзіць пад голад. Пасьля ачысткі, калі свайго насеньня мала, магчыма атрымаць крэдыт і купіць неабходнае насеньне збожжа, або бульбы, вікі і іншых культур.

Аб мінэральных угнаеньнях.

Трэцяе—у нашага сялянства не хапае ўгнаеньня, пагэтаму ў нас такія слабыя ўраджаі. Як галодная карова ня можа даваць добрага ўдою, так і галодная зямля ня будзе даваць добрага ўраджаю. У серадняцкіх і асабліва ў бядняцкіх гаспадарках свайго гною не хапае, пагэтаму праз крэдыт, а ён адпушчаецца, трэба прыкупіць штучнага ўгнаеньня, і, калі зямлю ўгнаіць, дык яна дасьць добры ўраджай.

Бунт супроць трохпалёўкі.

Чацьвертае—там, дзе праведзена земляўпарадкаваньне і там, дзе яно праводзіцца, сялянкі павінны ставіць пытаньне аб пераходзе на шматпольле замест трохпольля. *Сялянкам пара падняць бунт супроць трохполкі.* Якое гэта жыцьцё ў бядняцкай і серадняцкай сям'і на трохполцы, калі сям'я (асабліва ў бедняка), не даядае і сянцы, больш, чымся каму-б то ні было, прыходзіцца адчуваць. Пара зрабіць гаспадарку прыбытковай і дзеля гэтага пераходзіць на шматпольле. Кожны агроном пакажа сялянству, як перайсьці на шматпольле, толькі трэба гэтага захацець, і кожны селянін паставіць гаспадарку пановаму.

Высявайце культурныя травы.

Пятае—каму больш, як не сялянцы прыходзіцца клапаціцца аб жывёле—каровах, сьвіньнях птушках. А ў нашага, асабліва бядняцкага, сялянства каровам, сьвіньням, птушкам прыходзіцца галадаваць ня менш, чымся самаму селяніну. Зразумела, што ад такой жывёлы ніякага ня можа быць прыбытку. У селяніна жывёла мучаецца. У нас, напрыклад, у Беларусі, у тых раёнах, дзе няма лясных выпасаў, і летам сялянская жывёла галодная. Што павінна зрабіць сялянка? Дабіцца таго, каб у гаспадарцы разам з палепшаньнем сенажацяй *уводзіўся палявы травасеў,—канюшыны, вікі, сэрадэлі, і больш за ўсяго кожная сялянка павінна дабіцца ў сваёй гаспадарцы пасеву кармовых карняплодаў (кармовых буракоў, турнэпсу морквы).*

Калі за межамі добра карову кормяць, дык там адна карова ў год дае *200 вёдзер малака,* а ў нас у Беларусі—толькі *56 вёдзер.*

Такім чынам, адна карова Нямеччыны і Данії замяняе па ўдою нашых 4-х кароў.

Кожная беларуская сялянка павінна дабіцца таго, каб яе карова давала ня менш 100 вёдзер малака ў год, дзеля гэтага трэба вырашчваць у гаспадарцы неабходныя кармы—сеяць канюшыну, віку, сэрадэлю, кармовыя карняплоды.

Палепшым нашы агароды.

Шостае—у нас у бядняцка-серадняцкіх гаспадарках яшчэ надзвычайна кепска пастаўлена справа з гародніцтам. У сялянства не хапае прадуктаў гародніцтва і садоўніцтва, а пры нашым малазямельлі мы павінны арганізаваць высока прыбытковую сельскую гаспадарку, у якой-бы гародніцтва і садаводзтва займала адно з відных месц. Прадуктамі гародніцтва сялянства ня толькі павінна сябе здавальняць, але-ж і мець шмат гэтай продукцыі на продаж і вываз.

Нашы сялянкі не навучыліся яшчэ арганізоўваць прыбытковае гародніцтва. Неабходна ў кожным раёне арганізаваць хоць бы адзін паказальны город і сад, на якіх сялянкі мелі-б магчымасьць на практыцы ўбачыць, як такія гароды арганізаваць у сваёй гаспадарцы. Цяпер пры земляўпарадкаваньні мы адводзім сялянству шырокія сялібы, ня менш амаль што дзесяціны, і кожны земляўпарадкаваны двор мае магчымасьць арганізаваць досыць вялікі город.

З. Прышчэпаў.

Актывісты, дэлегаткі, грамадзяне павінны зараз на сваіх сходах абгаварыць пытаньне аб пасеўнай кампаніі і тыя мерапрыемствы, якія вядуць да палепшаньня і калектывізацыі сель.-гаспадаркі.

РАБОТНИЦЫ И КРЕСТЬЯНКИ ВОЕНИЗИРУЮТСЯ

В конце февраля в Минске при Доме Красной Армии состоялись общегородские состязания стрелковых кружков. Состязания прошли довольно активно. Первый приз на лучшего стрелка получила тов. **Лаврова.**

А. Соколова—работница Витебского Коммунального Треста. В 1921 г. 17 марта участвовала в подавлении Красными эсеровского восстания в Кронштадте. Участвовали также рабочие, приехавшие в Москву на с'езд. Витебские 45-е, Смоленские 31-е, Гомельские и Московские Военные курсы.



Надежды на победу не гасли.

Тяжелое время было—1919 год. В то время находилась я в 12-й армии. Только думали и ожидали, что даст завтрашний день. Для большей ясности положения—следишь за картой военных действий, а карта показывает далеко неотрадное, и „кольцо", нас окружавшее, все больше суживалось.

Но вот приходят товарищи из разведки (среди них был один хороший товарищ, Маруся Домбровская) больные физически, но с бодрым духом, воодушевляющими новостями, что красных ждет с нетерпением пролетариат Киева и крестьяне деревень. Скоро начали мы расширять „кольцо". Из Новозыбкова (Гомельской губ.) передвигаемся в город Нежин и из гор. Нежина в город Киев. Когда нам нужно было уехать из Нежина один товарищ, находясь в помещении, где был отчаянный холод, хотел снять хорошую дверь, чтобы протопить им камин: „мол, все равно мы сегодня уезжаем отсюда". Я не согласилась говоря, что в этом хорошем доме, может быть, не завтра, а через короткое время придется жить нашему брату. Дверь осталась несорванной.

Вот так в нас жил дух, что победим и будем пользоваться теми богатствами, которые завоюем.

Вспоминаю другой момент из военного прошлого. 23 августа 1919 года я ушла со штабом 47 дивизии Черноморского Красного Флота на фронт. По дороге у нас была массовая заболеваемость возвратным тифом, кроме того, от ненормальной жизни у многих осложнились хронические болезни (эпилептики, венерики и т. п.), никаких медикаментов, за исключением аспирина, не было.

Плохо было еще то, что мало было специалисток — сестер милосердия, которые были пропитаны нашим революционным настроением. Наши санкружки имеют огромное значение. В случае войны женщинам, обучающимся в кружках, будет легче работать.

Сигалова.

Санкружок на кожзаводе „Большевик" (г. Минск).

Жизнь труженицы в Латвии.

Заработок женщины, при одинаковой квалификации труда и рабочем дне (от 10-12 часов), с мужчинами, равен 79% заработка мужчины, что составляет 1,8 лата (на наши деньги—62½ коп.). Условия труда во всех этих мелко-промышленных предприятиях не соответствуют ни малейшим требованиям охраны женского труда.

Всюду самовластная рука хозяйчика. Непосильный труд женщин.

На разных фабриках, конфектных, обувных, консервных, производства бутылок и т. д. швейных, вязальных и шапочных мастерских, красильных, прачешных, всюду и везде работа поставлена так, чтобы владелец мастерских, фабрик мог добиться наибольшей прибыли за счет продолжительности рабочего дня и здоровья работающих, всюду рука самовластного хозяйчика, выжимающего последние соки из рабочего. Крайняя нужда заставляет женщину заниматься даже не свойственным ее организму и физическим силам трудом—поступать грузчиком на пароходы, приходящие в латвийские порты, или же на каменоломни.

В Польше. Ведут арестованную на демонстрации.

На складах тряпок Бальсона (в Риге) работают только одни женщины (их труд дешевле). Помещение холодное, пол песчаный. Воздух полон смрада и пыли. Вентиляции нет. Тут же, не умывшись, обедают. Работницы руками таскают на третий этаж громадные тюки тряпья. Дневной заработок при двенадцати часовом рабочем дне—1,7 лата *).

В городских больницах рабочий день—12 часов, исключений и для санитарок заразного отделения нет; санитарка обслуживает по 20-30 человек больных. В детской больнице (2-я городская) на одну санитарку приходится по 40 человек детей.

Дети без призора. Больничные кассы на бумаге.

Вернувшись домой с работы, женщина-мать еще должна стряпать, накормить семью, шить, штопать, ухаживать за детьми и т. д. Думать о чтении, об увеличении своих знаний не приходится. Утром, уходя на работу, работница-мать принуждена детей своих запирать (если они еще не посещают школу) в комнате. И сколько несчастных случаев с такими, без надзора оставленными, детьми. Зимою 1926-27 года в Риге было несколько случаев, когда по разным причинам загорались дома и запертые в комнатах дети сгорали. У правительства нет денег для трудящихся, но есть деньги на покупку подводных лодок, на техническое вооружение армии, на увеличение ее. Деньги есть на содержание громаднейшего штата полиции. Деньги есть и для тюрем, куда нужно сажать трудящихся.

Больничные кассы своим участникам и всем членам семьи выдают во время болезни, при родах, несчастных случаях и т. д. некоторую медпомощь и денежное пособие. Но так как большинство владельцев разных мелких предприятий и мастерских не страхуют своих рабочих в больничных кассах, то вне касс остается очень большой процент женщин - работниц. Последние во время болезни, или при несчастных случаях должны сами заботиться о себе или же погибать.

Многие женщины-матери, а также одиночки, не в состоянии перенести все ужасы голода и холода—и из отчаяния прибегают к самоубийству или же—занимаются проституцией. (В Латвии одних регистрированных проституток свыше 3300 человек)

40% политзаключенных в латвийских тюрьмах—женщины.

Из политзаключенных в латвийских тюрьмах—женщины составляют до 40%. Из этого можно заключить, что женское движение в Латвии в достаточной мере сильно и женщина активно вступила на путь революционной борьбы против существующего строя.

Все пытки и истязания, которым подвергается трудящаяся женщина в охранке, после ареста она переносит с необыкновенным мужеством.

Существуют в Латвии также и разные национальные и фашистские женские организации, но последние не пользуются абсолютно никаким влиянием среди женщин работниц.

*) Лата на наши деньги равняется приблизительно 33 коп.

27/XI—27 года при Рижских (левых) профсоюзах сорганизована женская секция. Эта секция ставит своей задачей: 1) поднять активность неорганизованных женщин-работниц и вовлечь их в профсоюзы; 2) бороться за экономическое и политическое раскрепощение женщины, улучшение женского быта, введение восьмичасового рабочего дня, охраны материнства и младенчества.

Изнуренная тяжелой непосильной работой и продолжительным рабочим днем она легко поддается болезням. По неполным цифровым данным процент больных женщин равен 57% общего числа больных (мужчин 46%). Понятно, что у женщины работницы с изнуренным организмом и дети больные.

В Латвии уменьшается за последние годы деторождение. Так, в 1925 году родилось 41.796 детей, против 41.172 в 1926 году. С особенной жестокостью карают женщину за каждый аборт, но о проведении закона об охране материнства и младенчества—никто пока не думает.

Достижения труженицъ СССР для латвийских работниц и крестьянок—пока мечта.

Все, что является правом трудящейся женщины. СССР: одинаковая оплата труда с мужчинами, охрана женского труда, социальное страхование матери и ребенка и т. д. и т. д. это только мечта будущего трудящейся женщины Латвии. Но она верит, что эта мечта претворится в жизнь в недалеком будущем.

На Ўсходе Савецкага Саюзу.

Туркестанкі абуджаюцца да новага жыцьця.

Жанчыны Туркестана прыкованы на ўсё жыцьцё да хатняй гаспадаркі, да далікатнай і марудной работы па вышываньню каўроў, шаўковых хустак і цюбецеек, за зборам хлапка, заняты доглядам за скацінай і вінаграднікамі. Жыве ў жаночай палове хаты („ічкары"), ня сьмее паказвацца ў людзі.

Туркестанка закрывае рот, паказваючы гэтым, што яна, выходзячы замуж, ніколі ня будзе пярэчыць мужу ды яго бацькам. Да гэтага часу, ня гледзячы на забарону, практыкуецца прадажа жанчын замуж, выкуп за жанчыну (які ў Туркменаў называецца „калымам"), плоціць муж бацьком нявесты. Плоцяць коньмі, вярблюдамі, мукой, авечкамі, грашыма і г. д.

Самым цяжкім грэхам жанчыны лічыцца—бязьдзетнасьць. „Дзеці ёсьць радасьць, няма дзяцей—гора". Так кажуць у Туркменіі. І, ня гледзячы на гэта, ніхто не клапоціцца аб тым, чаму няма часамі дзяцей? А вінаватымі часьцей за ўсё бываюць мужчыны, бо яны, па неахайнасьці, заносяць у сям'ю шмат хвароб, у тым ліку ня мала вэнэрычных. Агляд кіргіскіх аулаў (вёсак) дае цікавы і разам з тым вусьцішны малюнак—70 проц. сыфілітычных захварэньняў—лічацца не заразнымі. І зразумела, чаму да 35 проц. цяжарнасьцяй канчаюцца выкідышамі, а калі і родзіцца, дык дажывае толькі да 4—5 месяцаў.

Няшчасныя кабеты, ня ведаючы прычыны сваёй бязьдзетнасьці, шляюцца да знахароў, бабак і нічога ня выходзіць. Шэпты, апырсківаньні вадой і падкурваньне—не дапамагаюць. Застаецца яшчэ адно: ісьці на могілкі сьвятога ды маліцца, поўзаючы па насыпе. Жаночыя хваробы ў аулах ня лечацца мясцовымі „лекарамі", жаночыя хваробы не прызнаюцца. Жанчына ня мае права хварэць.

Мужчына—гаспадар, уладар. Удава ня мае права выйсьці замуж другі раз, бо тады траціць права на сваіх дзяцей. Нават на сямейных вечарніцах жанчыне нельга паказацца без чадры (чадра лёгкі туль, якім закрываецца твар) і быць з мужчынамі.

У вырашэньні розных гаспадарчых пытаньняў жанчына ня ўдзельнічане, ў яе нават ня пытаюць, як і што рабіць. Далей „ічкары" ёй дарогі завязаны, забаронены.

За тое мужу, уладару, усё дазволена і часта жаніліся баі па 40—50 гадоў на маладзенькіх дзяўчынках, якіх бацькі прадалі па сходнай цане.

Так было да тэй пары, пакуль ня прышлі бальшавікі. Яны сьмела і рашуча пачалі будаваць, расьціць новы быт. Цяжка было вясьці работу сярод загнаных, прыняволеных туркменістанскіх жанчын. Але новае ўсё-ж *перамагло*. У абарону жанчыны выступае новы савецкі закон. Расчыняюцца вякамі зачыненыя дзьверы „ічкары", пачынаюць вучыцца ў новай школе ня толькі хлапчукі, але і дзяўчынкі. Кабеты пачынаюць зьвяртацца за парадамі ў консультацыю, да доктара; яшчэ ў 1926 годзе было сыграна тут першае чырвонае вясельле.

Сонны ўсход абуджаецца—новы, савецкі быт, прыходзіць на зьмену. Жанчына ўсходу выходзіць на шлях вольнага жыцьця.

А. Г-скі.



Узбечки—члены сельсавета.

НА МАЛАДОЕ

Апавяданьне **М. Зарэцкага.** *Малюнкі мастака* **Гуткоўскага.**

Зьмест папярэдняга. Адбылося апошняе спатканьне Марылькі з Васільком. Ніяк ня мог пагадзіцца малады дзяцюк са сталым рашэньнем Марылькі застацца жыць з Ахрэмам. Ня верылася неяк, не хацелася верыць! Але Марылька ня ўступіла на гэты раз угаворам каханага. І Васілёк з вялікім нечаканым горам пакінуў вёску. Радасьць Марылькіна зблякла, зьнікла—жыві з нялюбым дый каханак, здавалася ёй, забыўся на яе. Час ішоў... І новая, нязьведаная радасьць выбілася бурнай крыніцай—узварухнулася нешта пад сэрцам Марылькіным, гэта—на маладое... Цалкам аддалася новаму пачуцьцю... А Ахрэм падсыпаў ёй у пітво цішком зельля... Марылька паехала раз да маткі і зьлягла... Думалі, што гэта ад цяжарнасьці так. Але станавілася ўсё горш і горш. І Міхась, яе браценік, паехаў у горад за доктарам... Марылька папрасіла пераказаць Васільку пра сваю хваробу... Так прагна хацелася бачыць яго!

Ці ўспомніць яе? Ці ўспомніць мінулае? Яна, дык ні на хвіліну не забываецца на тое, што было калісь, што непазбыўнай красой жыцьцё ёй аздобіла. Яна толькі і жыве гэтымі ўспамінкамі... Ды яшчэ надзеяй, захаванай надзеяй, што будзе ў яе Васілёк, другі, маленькі, любы... К вечару Марыльцы пагоршала. Грудзі вострым агнём агарнуліся. Зусім цяжка стала дыхаць, быццам не хапала паветра. Здавалася, каб чагось сьцюдзёнага, ледзянога ўліць у нутро, дык-бы палягчэла, бо агонь там, жывы агонь бушуе...

А сьвінец у галаве распусьціўся, расплыўся, заліў сьвядомасьць пялёнкай зыбкай, атрутнай.

Заснула Марылька ліхаманкавым сном, затрызьніла ў гарачцы.

X.

Марылька бачыла сон, цяжкі, страшэнны. Як толькі заснула, пачула адразу, быццам нехта моцным цяжарам узьлёгся на яе, нехта вялізны, страшэнны, клюшнямі балюча ўпіўся ў бакі, а грудзьмі сваімі грудзі ёй душыць. Марылька ўяўна адчувае гэтыя страшэнныя грудзі. Жосткія, жалезныя. У іх костка ўрасла, мулкая, вострая. Яе асабліва балюча адчувае Марылька. Здаецца, праламала яна ёй грудзі, уелася аж у нутро саменькае, муліць, цісьне, не дае ўвабраць у грудзі паветра.

Варочаецца, стогне Марылька, стараецца скінуць з сябе жудасную нахабу. Але не даецца.

Сьмяротны адчай, сполах агнявы ахапляе. Бачыць Марылька твар перад сабой, жосткі, страшэнны, агідна скрыўлены, працяты нечалавечай злосьцю. Нешта знаёмае, блізкае, нехта свой...

Ахрэм!.. Гэта-ж ён мучыць яе, ён задушыць яе хоча...

— Ахрэм! Пусьці! За што ты?.. Людцы, ратуйце!..

Але ніхто не ратуе, няма навокал нікога..

Не, нехта ёсьць, стаіць воддаль няясным ценем, хто гэта?.. Гэта-ж Васілёк... ён, вядома, ён... Ён выратуе зараз, ён звольніць яе ад Ахрэма...

— Васілёк! Ну чаго-ж ты стаіш? Ці-ж ты забыўся на Марыльку на сваю? Ратуй яе, абарані!.. Бачыш, душыць ён, хоча забіць... Васілёк!

А дзе-ж ён падзеўся?.. Няма Васілька. Плакаць хочацца Марыльцы, сьлёзы падступаюць да горла. Каму пажаліцца? У каго шукаць абароны?..

Вось нехта, здаецца, падыходзіць. А, гэта Міхаська, браток.—Міхась мой, родны!..

Міхась хоча схапіць Ахрэма, узьнімае руку, але, замест Ахрэма, хапае яе проста за сэрца.

Ужо Ахрэма няма, толькі Міхаська ўсё нешта трымае за сэрца, цісьне яго, вырывае з грудзей. І крычыць чагось, як звар'яцелы.

— Дохтара прывёз! Дохтара прывёз! Марылька! Марылька! Прачніся!

І прачнулася Марылька...

Са зьдзіўленьнем азірнулася наўкола. У цьмяным жаўтаватым сьвятле схіліліся над ёю нейкія постаці. Міхась лапатаў весела:

— Ну вось... моцна ты сьпіш Марылька, ледзь збудзіў... Вось дохтар прыехаў, зараз абгледзіць цябе.

Марылька ўбачыла поплеч з Міхасём незнаёмага чалавека ў чорнай вопратцы. З зацікаўленасьцю зірнула на яго твар. Мяккія вусы, бародка, вочы сур'ёзныя, але ветлыя. Пачула шчырую даверлівасьць да гэтага чужога чалавека.

А там, далей, нехта трэці. Таксама ў чорным. Нешта знаёмае ў адкрытым прыгожым твары...

Васілёк!.. Ён прыехаў, ён тут. Ня кінуў, не забыўся на яе!..

Радасьць агнём працяла. Адразу ўскочыць хацела, кінуцца да любага, але прыціскала нешта да ложка.

Потым Марыльцы добра так, прыемна зрабілася. Нейкай асаблівай прытульнасьцю ахінулася хата. Быццам пасьля доўгай адлучкі трапіла яна ў кола сваіх родных, блізкіх.

— А дзе Ахрэм?—раптам усплыло на думку.

Азірнула хату. Матка нікае ўзад і ўперад, пасьпешна парадкуе хатнія рэчы. Бацька на лаўцы сядзіць, узіраецца на ўсё бязуважным поглядам: стары ўжо, яму толькі каб сядзець спакайней, каб не чапалі яго.

Ахрэма няма. Пэўна, некуды вышаў. Як гэта добра, што яго няма. Няма і таго цяжару, што гнётам ускладае яго прысутнасьць.

Тымчасам дохтар пачаў абслухваць яе, абстукваць. Яна трывала цярпліва, але ў думках чакала, каб хутчэй адышоўся, бо вочы міжвольна шукалі Васілька, яго чакала да сябе Марылька.

Дохтар абслухаў, сказаў бадзёрым, вясёлым голасам.

— Нішто маладзіца, паправіцеся, арганізм дужы, малады,—ён пераможа.

Дохтар адышоўся, сеў да бацькі на лаўку пачаў гутарыць з старым.

Тады падышоў Васілёк, прывітаўся, сеў на край ложка. Яна сударагава прыціснула яго руку да сваіх хворых грудзей. Зазірнула ў твар яму палкім, ліхаманкавым поглядам.

— Ты прыехаў, Васілёк... Які ты добры...

Больш не магла гаварыць, сьціснулі горла нечаканыя сьлёзы. З усіх сіл трымалася, каб не заплакаць.

Васілёк пяшчотна гладзіў яе галаву, глядзеў ёй у вочы кахаючым, поўным нявыказанага жалю поглядам.

— Марылька, любая, што-ж гэта ты... Як гэта табе прытрапілася? Пэўна, не сьцераглася, застудзілася...

— Я папраўлюся, Васілёк, хутка папраўлюся. Мне ўжо лягчэй. Я заўтра, пэўна, ужо ўстану... Як ты добра зрабіў, што прыехаў. Ой, як мне сумна было ўвесь час, як цяжка. Кожную хвілінку цябе ўспамінала. Мо' з нуды і прылучылася мне гэта хвароба...

— Марылька! Навошта ты так зрабіла? Ня было-б гэтага...

— Маўчы, Васілёк, я і сама каялася... Слухай. Я хутка папраўлюся. Тады я кіну Ахрэма... Бо ня змога мая ўжо... А мо' ты цяпер не захочаш? Васілёк?

Ён моцна сьціснуў яе гарачую руку.

— Як табе ня сорамна, Марылька!

— Ну, добра... А ведаеш што? Я маю сказаць табе нешта дужа, дужа цікавае. Давай сваё вуха...

Васілёк нахіліўся да яе.

— Слухай, Васілёк, у мяне будзе нехта... сын будзе... твой, Васілёк.

Яна глядзела саромліва і разам здаволена, чакала, як ён адкажа на гэтую навіну. У вачох Васілька загарэлася новае пачуцьцё, новая пяшчота. Сказаў толькі:—Марылька, сонейка маё яснае...

А яна далей гаварыла:—Гэта і хвароба ў мяне з гэтага. Так заўсёды бывае. Кожны хварэе. Гэта ў мяне—на маладое. А дохтар ня ведае, я не сказала яму. Я нікому не казала, толькі мамцы аднэй.. А ты, Васілёк, будзеш любіць яго?..

— Буду...

— Ну, вось і добра. Цяпер ты раскажы, як табе там жылося... Васілёк, ты мяне ў горад возьмеш з сабою, га?..



...Пачула шчырую даверлівасьць да гэтага незнаёмага чалавека.

— Ну, дык як-жа. Абавязкова вазьму, будзем жыць з табой разам. Ты таксама на работу паступіш. У нас на заводзе жанчыны поруч з мужчынамі працуюць і няма таго, каб, калі ты баба, дык ужо і ня лезь туды, куды табе не належыць. Баба зусім роўная з мужчынамі.

Васіль пачаў апавядаць пра рабочае жыццё, пра заводзкія парадкі. Марылька ўважна прыслухоўвалася да яго ласкавага голасу. Чула ў ім новыя таны, якія нібы адбівалі тое невядомае, сьвежае, што ўвабраў у сябе Васілёк за час расстаньня. Слухмянае ўяўленьне малявала ёй вобразы таго жыцьця, з якога прышоў цяпер да яе Васілёк. Жывога, цікавага і разумнага.

Стала Марыльцы добра так, лёгка. Быццам зьляцеў той цяжарны гнёт, што душыў грудзі. Толькі муць у галаве яшчэ плавала, яшчэ блытала няслухмяная думка.

Раптам у хату зьявіўся Ахрэм. Пахіліў галаву; твар задумёны, пануры. Васілёк, як убачыў яго, устаў, адышоўся.

З сполахам чакала Марылька, як спаткаюцца. Мо' лаяцца будзе Ахрэм? Сэрца забілася, а ўзрушаны ўздох спаткаўся глыбока ў грудзёх з балючым клубком.

Не, нішто. Толькі сярдзіта зірнуў Ахрэм у бок Васілька ды вусны скрывіў у недалужна-злосную ўсьмешку. Прыкрая маўчанка на момант атуліла хату.

XI.

Дохтар згадзіўся застацца нанач. Дужа прасіў Васілёк, бо бачыў, што моцна хварэе Марылька, што сьмерць ужо павісла над ёю.

Ноччу Марылька страціла прытомнасьць. Трызьніла страшэнна, жудасна. Часта памінала Ахрэма, Васілька, горад, завод. Часам стагнала, крычала, быццам мучыў хто яе, а часам нібы заціхала, заспакойвалася. Тады ўсе прысутныя адчувалі ўзмах скрыдлаў сьмерці, з сполахам чакалі канца.

У адну з гэтых хвілін Васілёк адвёў у бок дохтара.

— Слухайце, скажэце, калі ласка, толькі праўду, шчырую праўду... ці ёсьць якая надзея? І чакаў з напружанасьцю, што скажа дохтар. Той паглядзеў на яго сваім мяккім, ласкавым поглядам.

— Хто яго ведае, трудна згадаць, чым кончыцца... Але мала надзеі. Арганізм надламаны ўжо, цяжка змагацца яму з хваробаю...

Твар дохтара стаў асабліва сур'ёзным. Ён упіўся поглядам у Васілька.—У мяне ёсьць падазрэньне, але, вядома, я ня ўпэўнены ў гэтым і, калі скажу Вам, дык толькі спадзяючыся на Вашу сумленнасьць і сьціпласьць. Ёсьць прыметы, што хворая атручана. Якой атрутай—невядома. Можна меркаваць, што ўжо доўгі час яна нейкай атрутай падрывала свой арганізм, а цяпер мы бачым астатні, заключны акт...

Васілёк аслупянеў ад нечаканасьці, потым мігнула думка: Ахрэм...

Нявыразная, няясная здагадка прымусіла здрыгануцца ад міжвольнага жаху, і разам пякучай гаркотай разьліўся па нутры нявымоўны жаль. Кінуўся да Марылькі з адчаем, з бязьмернай пяшчотай глядзеў на яе змучаны зьбялелы твар.

А поплеч дохтар стаіць, чаго ён чакае? Чаму ён ня дасьць зельля якога, каб вылечыць, каб выратаваць?..

— Дохтар! Зрабіце што, колечы, ратуйце. Няўжо вы ня маеце спосабу?

Дохтар пакачаў галавой.—Бываюць выпадкі, калі і навука нічога ня можа зрабіць.

Тады Васілёк сеў на лаўку, закрыў твар рукамі і ціха, падзіцячаму, заплакаў.

Ціха ў хаце было, ня спаў ніхто, але ўсе маўчалі або гаварылі шэптам, быццам сьцерагліся, каб не парушыць астатняга спакою хворае. Трывожная ўрачыстасьць распасьцерлася ў хаце.



... Сэрца зьнібее... Але плакаць ня хочацца... Няма сьлёз...

Потым раптам замятушылася матка старая, да абразоў чагось падбегла. Міхась ціха, але цьвёрда сказаў:—Ня трэба...

І матка скарылася, моўчкі хліпнула носам.

Яшчэ колькі хвілінак напружанай, застыглай маўчанкі і потым, быццам загачаная рэчка, прарвалася. Разьлілася наўкола бясконцавай патокаю. Гэта загаласіла, завыла на ўсю хату старая матка.

Васілёк узьняўся, ціха азіраўся наўкола. Быццам не разумеў, што тут робіцца. Дзіўным здаваўся гэты працяжлівы гвалт старое, дзіўным і жудасным, бо шкуматаў ён і рваў нутро сваімі надрыўнымі ўзрывамі.

Зірнуў Васілёк на Марыльку...

Не пазнаў. Дзе падзеліся тыя любыя прыгожыя рысы знаёмага твару?

Замест іх—нешта бязьлічнае, застыглае, вашчана-белае.

Тады яскрава зразумеў Васілёк, што няма ўжо Марылькі, няма і ня будзе ніколі... Пуста стала ўнутры. Ня плакаў, толькі моцна сьціснуў зубы, каб стрымаць душэўны боль. Азірнуў моўчкі ўсіх прысутных. Спыніўся поглядам на Ахрэме, які стаяў

воддаль і сьлюнява сморгаў чырвоным носам. Ці плакаў, ці мо‘ від рабіў толькі, што плакаў...

Васіль раптам падышоў да яго, упяўся сталёвым халодным поглядам у спалоханы, раптам зьбялелы твар, сказаў—прасіпеў ад гневу здушаным голасам:—Што ты зрабіў з ёю?

— Што я зрабіў?.. Нічога я ня ведаю... Нават ня знаю, з чаго гэта ў яе пачалося. .

Васіль бліжэй наступіў да яго, сьцёбануў проста ў твар жорсткім шэптам.—Гавары ўсё, зладзюга...

Затросься яшчэ болей Ахрэм.

— Ня ведаю. Дадушы, ня ведаю. Можа з гэтага зельля... Гаўрыліха мне давала...

— З якога зельля?—І тады Ахрэм, захліпаючыся, зьбіваючыся, стаў апавядаць пра ўсё, як браў зельле ў Гаўрыліхі, даваў у няпрыметку Марыльцы, як ён тут ужо, у бацькоў, баючыся, каб не прапала дарэмна ранейшае, даў ёй апошнюю, мусіць, занадта вялікую частку гэтага зельля.

Усе змоўклі, слухаючы Ахрэмава каяньне. Было дзіўнае, жудаснае яно над сьвежым целам Марылькі. Здавалася, што нябожчыца чуе гэта, што пільней за ўсіх прыслухоўваецца яна да страшэннага прызнаньня свайго мужыка. Кожны нібы адчуваў сябе вінаватым перад гэтай, без пары загінуўшай, згубленай жанчынай.

Васіль сядзеў ля нябожчыцы, пахіліўшы галаву ў глыбокім задуме. Не злаваўся больш на Ахрэма. Што-ж ён? цёмны, мізэрны. У цемры радзіўся, жыў у цемры. Урос у прадвечныя забабоны.

А Марылька?.. Бедная яна!.. Панікла без пары, як кветка ў дрэнным атрутным паветры. Зацягнула небараку згубная прорва жыцьцёвае багны.

Сэрца зьнібее. Нявыведны жаль гняце, сьціскае нутро абцугамі балючымі. Але плакаць ня хочацца. Няма сьлёз. Сьлёзы ў таго, хто губляе ўсё, хто стаіць перад цёмнай пустыняй і ня бачыць нічога наперадзе. Сьлёзы ў таго, хто разам з каханым прадметам губляе надзеі, губляе сэнс свайго жыцьця.

Васілёк не з такіх. Васілёк моцна стаіць у жыцьці, не зварухне яго няшчасьце, ён ведае, што наперадзе—не заблудзіць...

Успамінае Васілёк астатнія часіны жыцьця Марылькінага. Як яна хацела жыць! Як радавалася, што ён зьявіўся падтрымаць яе, пасобіць узьняцца з гнілога балота... А тая палкая надзея, смаглае жаданьне таго, хто зьвязаў-бы іх, ды ўжо нават зьвязаў, новымі нязьведанымі путамі.

— На маладое...

Бедная! Любая! Ці ведала яна, што праўду казала гэтымі словамі? Ці ведала яна, што цяпер у муках, у болі нараджаецца новае жыцьцё—разумнае, вольнае. Многа цяжкіх, часам бязьвінных ахвяр справаджае гэтае нараджэньне. Але гэта—неабходная, няўхільная хвароба жыцьця...

Бо гэта—на маладое.

Як павінен працаваць гурток „прыхільнікаў часопісі“.

„Беларуская работніца і сялянка“ ўсё больш унядраецца ў гушчу работніц, сялянак і жонак рабочых. Аб гэтым гавораць лічбы: усё больш павялічваецца падпіска на часопісь. Але яшчэ больш, чым падпішчыкаў, мы маем чытачоў нашае часопісі.

